# СЕКЦИЯ СЛАВЯНСКОЙ ФИЛОЛОГИИ

## ФЕНОМЕН СНУ Ў КНІЗЕ Я. БАРШЧЭЎСКАГА “ШЛЯХЦІЦ ЗАВАЛЬНЯ”

***В. А. Агеева*** *(УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***М. У. Аммон,***
*асістэнт*

Ёсць дзве знакамітыя алегорыі сутнасці чалавечага існавання на Зямлі: “Жыццё ёсць сон” і “Жыццё як гасцініца”. Сапраўды, сон займае значную частку нашага існавання і з’яўляецца своеасаблівай падрыхтоўкай да смерці, ці Вечнага Забыцця. Што тычыцца другога іншасказання, то можна ўявіць сабе кожнага з нас як маленькую крупіцу Сусвету ці ў ролі выпадковых “пастаяльцаў” гасцініцы пад назвай планета Зямля.

Праўдзівасць апошняга выслоўя можна прасачыць у аўтабіяграфічнай па сваёй сутнасці кнізе Я. Баршчэўскага “Шляхціц Завальня” (дзядзька апавядальніка прымаў на нач падарожнікаў за своеасаблівую плату – цікавыя расповеды з жыцця). Акрамя таго, дзеянне ў творы адбываецца ў позні час сутак, а незвычайныя гісторыі можна асацыіраваць са знаёмымі з дзяцінства жахлівымі казкамі перад сном.

Ноч у тэкстах беларускага аўтара заўсёды з’яўляецца носьбітам містычнага пачатку. Пісьменнік у вынасным тлумачэнні адзначае: “Жыве сярод беларусаў вера, што апоўначы заўсёды шумяць лясы і вада ў азёрах адначасова з крыкам пеўня робіцца неспакойнаю” [1, с.132]. Мяжа паміж рэальным і ірэальным надзвычай адчувальная для чалавека, які страціў маральныя арыенціры: “Прапаў сон, бо і ў час адпачынку заўсёды гучаў у маіх вушах роспачны голас бацькі, лямант дачкі, і сабакі рвалі маё цела” [1, с. 131].

Снабачанне ў гэтым творы служыць сродкам знаходжання паразумення з унутраным “я” і акаляючым асяроддзем, сімвалам смерці, адмаўлення грахоўнага мінулага. Абуджэнне ж выступае своеасаблівым перараджэннем персанажа ў саўпраўдным свеце: “Я крыху супакоіў свае думкі, мог ужо заснуць... ; у сне мілыя мроі нагадвалі мне пра мінулае, калі быў яшчэ чалавекам” [1, с. 134]; “барукаючыся са смерцю, я прачнуўся... Бачу: я – чалавек... Здавалася мне, што ўсе дрэвы і птушкі віншавалі мяне з новым жыццём” [1, с. 135]. Дадзены момант утрымлівае цьмяную алюзію на міф аб птушцы фенікс, здольную да перараджэння са свайго ж попелу.

Такім чынам, чытач кнігі Я. Баршчэўскага акунаецца ў незямны, прывідны свет, у цемру панавання жахлівых цмокаў, неспакойных сноў людзей, прадаўшых д’яблу душу і, наадварот, салодкіх мрояў праведнікаў. І гэта сапраўды фенаменальна, алегарычна, як і ў жыцці кожнага з нас.

**Літаратура**

1 Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 1998. – 480 с.

## ДУХОЎНЫЯ ПОШУКІ ІНТЭЛІГЕНТА Ў ТВОРЧАСЦІ М. ГАРЭЦКАГА

***А. У. Аўрамёнак*** *(УА «МДУ імя А. А. Куляшова»)*
*Навук. кір.* ***А. В. Шарапава,***
*ст. выкладчык*

М. І. Гарэцкі з’яўляецца цікавым, арыгінальным пісьменнікам і вучоным, адным з пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы. Вобраз інтэлігента хваляваў мастацкае ўяўленне М. Гарэцкага на працягу ўсяго творчага шляху. Роля інтэлігенцыі ў жыцці народа трактуецца М. Гарэцкім своеасаблівa. Як правіла, у сусветнай літаратуры